Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

25 ЛІСТАПАДА 2017 г. СУБОТА №228 (28592)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



## Сляды ад куль на лабавым шкле

СТАР. 3

**Увага: прамая лінія!**

**Газета «Звязда» праводзіць прамую лінію па тэме «Як спажыўцу адстаяць свае правы?» Ці можна вярнуць у краму абутак, набыты падчас распродажу? Што рабіць, калі замарожаная рыба аказалася сапсаванай? Ці можна не плаціць за стрыжку, калі яна вам не падабаецца? Куды звяртацца, калі вам прадалі бракаваны тавар?**

Гэтыя і іншыя пытанні можна будзе задаць у наступны чацвер, **30 лістапада, з 11.00 да 12.00** па тэлефоне **287-18-71.** Адказваць на іх будзе **старшыня Беларускага таварыства абароны спажыўцоў Ганна Уладзіміраўна СУША.**

Папярэдне пытанні можна задаць па тэлефоне 287-17-50 ці даслаць на электронны адрас lubneuskaya@zviazda.by з пазнакай «прамая лінія».

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Валерыя КЛІЦУНОВА, старшыня праўлення Беларускага грамадскага аб'яднання «Адпачынак у вёсцы»:**

*«Наш сельскі турызм вельмі змястоўны. А спачатку ж мы хацелі зрабіць проста сетку міні-гасцініц з ежай. Пасля сталі ўзнікаць пытанні: а чаму людзі павінны туды ехаць, чым займацца ў беларускай вёсцы? Таму трэба было падумаць пра турыстычны прадукт, пра ўзаемадзеянне, кластары, зялёныя маршруты, каб развіваць разам нейкую пэўную тэрыторыю. І тое, што гэта ўдалося зразумець і пайшоў адпаведны працэс, лічу каласальным плюсам. Да таго ж апошнім часам мы прасоўваем ідэю крэатыўнай эканомікі: калі ты робіш нешта за кошт сваіх ведаў, таленту і ўмення. Гэта значыць, прыдумваеш тое, што здольна ўразіць турыста. І людзі едуць па ўражанні, што робіць нас канкурэнтаздольнымі на рынку».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 25.11.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9980 | ▲ |
| Еўра | 2,3676 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0341 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0743 | ■ |

ISSN 1990 - 763X

# Ключы ад дома

У ваенным гарадку Заслонава Лепельскага раёна ва ўрачыстай абстаноўцы здалі ў эксплуатацыю пасля капітальнага рамонту дом на 70 кватэр. На здымку: ключы ад новай кватэры — у руках камандзіра ўзвода Яўгена ТОЗУРА, яго жонкі Сняжаны і дачкі Аляксандры.



Фота БЕЛТА.

■ Безбілетнікі

## Кантралёр — у дзверы, «заяц» — у вакно

### Лаюцца, уцякаюць, падманваюць. Разумеюць, плацяць, выбачаюцца

**«Няма грошай — толькі картка», «не паспеў купіць талончык», «толькі ўвайшоў». Якіх толькі адгаворак не прыдумваюць пасажыры, калі іх «зловіць» кантралёр. І іншаземцамі прыкідваюцца, і за сэрца хапаюцца, просяць хуткую дапамогу выклікаць. І ўцякаюць з транспарту, забываючыся ў салоне пакеты, парасоны і... аднойчы пакінулі нават дзіця. Чаму пасажыры так баяцца кантралёраў і ці варта так да іх ставіцца, высвятлялі карэспандэнты «Звязды»...**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Кантралёр Тамара ВІШНЯКОВА: «Зайцы» паводзяць сябе па-рознаму».**

### ПА ЗАКОНАХ ЧАЛАВЕЧЫХ І ПІСАНЫХ

З **Тамарай ВІШНЯКОВАЙ і Раісай ЖУЧКО, кантралёрамі пасажырскага транспарту,** мы выехалі па маршруце Кунцаўшчына — Гарадскі Вал. Камеру яны ўключаюць яшчэ пры пад'ездзе транспарту да прыпынку і выключаюць толькі пасля выхаду на прыпынку. Так можна пасля даказаць, хто ўвайшоў разам з кантралёрамі, а хто маніць.

СТАР. 4

■ Галоўнае ў жыцці

## КАХАННЕ — ГЭТА ВАМ НЕ БУЛЬБА!

### Сямейныя пары з Глыбокага ў новым праекце расказваюць свае гісторыі

**У Глыбоцкім раёне ўжо паўгода доўжыцца сямейны праект «Заўтра было каханне». Арганізаваў і праводзіць яго народны сямейны клуб «Востраў разумення» гарадскога цэнтра традыцыйнай культуры і народнай творчасці.**

Нагадаем, гэта менавіта яго ўдзельнікі дзесяць гадоў таму прыдумалі і ўвасобілі ў жыццё адмысловы маладзёжны праект «Уладар вёскі», які неўзабаве выйшаў на рэспубліканскі ўзровень, і з таго часу праводзіцца ў краіне штогод. Гэта мы да таго, што арганізатарам чарговага конкурсу досведу ў такой справе не займаць і, хто ведае, можа быць, з цягам часу ён таксама стане папулярным не толькі ў асобна ўзятым раёне.

СТАР. 8



Фота Алены МЯНЖЫНСКАЙ.

**Пераможцы першага этапу — сям'я КАРПОВІЧАЎ.**

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПАДПІШЫСЯ — І ВЫЙГРАЙ КАШТОЎНЫЯ ПРЫЗЫ!

Пачалася падпіска на «Звязду» на І квартал і І паўгоддзе 2018 года!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!